**Вобразы кахання.** Тут былі сумныя вобразы жаночай долі, русалкі (апошняя досыць умоўная ўвыглядзе букета кветак) і даволі гарэзлівыя вобразы фізічнай блізкасці мужчыны і жанчыны. Распаўсюджаным арнаментам была дзяучына з поднятымі рукамі, якая трымае каласы і кветкі – Лада, багіня кахання і прыгажосці.

**Вобразы чалавека, сям'і, дзяржавы.** Сімвал чалавека васьміканцовая зорка – адзін з самых пашыраных сімвалаў у беларусаў. Бярозка ці рабіна – вобраз дзяўчыны, клён (явар) – хлопца. Сям'я – чатыры крыжападобна спалучаныя разеткі, нярэдка ў арнаментальнай аблямоўцы.

**Вобразы веры.** Перш за ўсё гэта сімвалы продкаў. На Беларусі заўсёды шанавалі дзядоў, перад памерлымі не было страху, пабачыць іх у сне не лічылася дрэннай прыкметай – наадварот – у іх прасілі дапамогі, рады, іх запрашалі на сямейныя святы. Сімвал агульнага продка – два перакрыжаваных прамавугольніка, унутры – маленькі крыжык. Сімвал роднага дзеда – крыж з чатырох квадратаў.

Акрамя гэтых сімвалаў у арнаментах беларусаў можна знайсці ўзоры душы (васьміканцовая разетка са скругленымі канцамі), узоры гаданняў, мараў, надзей.

УДК 94(476)

## ДУХОЎНАЯ СПАДЧЫНА Ф.СКАРЫНЫ Ў ЕЎРАПЕЙСКІМ І БЕЛАРУСКІМ КУЛЬТУРНА-ГІСТАРЫЧНЫМ ПРАЦЭСЕ

*Студэнты – Шайтанаў П.С., 3 мпт, 1 курс, АМФ;*
*Каротkіх У.В., 21 мо, 1 курс, ФТС*
*Навуковы кіраўнік – Смалянка Г.А., ст. выкладчык*
*УА «Беларускі дзяржаўны аграрны тэхнічны ўніверсітэт»,*
*г. Мінск, Рэспубліка Беларусь*

Ён першы кнігу даў славянам,
На простай мове ўзорны ліст!
Ён знаў: з-за хмараў валавяных
Праб'ецца сонца да зямлі.
А. Іверс

Праходзілі вякі, адыходзілі ў нябыт пакаленні, знікалі і развальваліся магутныя імперыі, а кніга - вялікае цуда, створанае

чалавечым розумам, - жыла, хвалявала сэрца, абуджала думку, клікала да сацыяльных перамен. Кніга жыватворным чынам уплывала на грамадства, садзейнічала развіццю навукі і тэхнікі, уваходзіла ў паўсядзенны побыт чалавека. Друкаваная кніга адкрывала новую старонку ў культурным жыцці народа, ішла праз рубяжы і межы з адной краіны ў другую, нястомна змагалася са злом і крыўдаю, прыгнётам і эксплуатацыяй.

Беларускі першадрукар Францыск Скарына – выдатны вучоны, вялікі асветнік-гуманіст і патрыёт роднай зямлі. Яго жыццё і творчая дзейнасць у галіне кнігадрукавання залатымі літарамі ўпісаны ў гісторыю развіцця і фарміравання беларускай культуры і грамадскай думкі, першай паловы XVI стагоддзя.

З кожным годам, з кожным дзесяцігоддзем мы ўсё больш выразна ўсведамляем веліч здзяйсненняў нашага першадрукара Францішка Скарыны.

У асобе Францыска Скарыны шчасліва спалучыліся не толькі мудрасць і розум вучонага, чалавека рознабаковай вучонасці і энцыклапедычных ведаў, але і асаблівы талент любові, дабрыні і спагады да ўсяго жывога і існага, што пад богам і вечным сонцам. А яшчэ незвычайна тонкае разуменне і адчуванне прыгожага, хараства. Сама Скарынава кніга была дасканалым узорам гарманічнага спалучэння і сінтэзу розных відаў мастацтва – слова, жывапісу, кніжнай графікі.

Што ж друкаваць у першую чаргу? Францыск Скарына быў вельмі далёкабачным, ён пачаў з «Бібліі», кнігі тады вельмі папулярнай і вядомай. Але, каб непасрэдна дайсці да простага чалавека, яна павінна быць выдрукавана толькі на зразумелай яму мове. Асвета народа не можа быць ненацыянальнай.

ІСкарына перакладае «Біблію» на беларускую мову. Ён вырывае з рук царквы ініцыятыву быць абавязковым пасрэднікам між кнігай і чытачом, адзіным тлумачом «святога пісьма».

Беларускі першадрукар са Свяшчэннага пісання бярэ тое, што не страчвае сваёй актуальнасці, сваёй грамадскай значымасці. У мове, як паказвае Скарына, раскрываюцца ўзаемаадносіны людзей, іх маральныя якасці, іх характары.

Францыск Скарына бачыў у кнізе не толькі крыніцу ведаў, але і твор мастацтва. Кніга прыносіць чалавеку эстэтычную асалоду і сваім знешнім выглядам, павінна быць зручнай і практычнай у карыстанні. І ў гэтым ён дасягнуў найвялікшых вяршынь.

Дакладней кажучы, кнігі беларускага першадрукара былі тым узорам, тым ідэалам, да якога на працягу двух стагоддзяў няспынна імкнуліся першыя друкары Еўропы.

Дзейнасць Францыска Скарыны склала цэлую эпоху ў культурным жыцці беларускага народа і садзейнічала яго сацыяльнаму і нацыянальнаму абуджэнню. Клапоцячыся пра асвету для простых людзей, ён даў ім першую друкаваную кнігу на роднай мове, а пераклаўшы «Біблію» на беларускую мову, ён тым самым узнімаў гэтую мову да ўзроўню класічных моў Еўропы. Такой асобай, як Францыск Скарына, мог бы ганарыцца кожны народ.

Скарына – сонца нацыянальнага Адраджэння! Сонца маладзіковае!

Адным словам, у абраным спосабе друкавання Скарына застаўся верным сабе: самастойным, крыху набожным, заходнім па складу думкі, свецкім. Карацей кажучы – гуманістам. Сам факт заснавання друку на роднай глебе спрыяў сцвярджэнню яго патрыятычных і чалавекалюбівых памкненняў.

Імя Францішка Скарыны – нашага слаўнага земляка, першадрукара ўсходніх славян, асветніка-гуманіста – стала сімвалам адраджэння беларускай мовы, культуры, нацыянальнага гонару Беларусі.

Жыццё і дзейнасць Скарыны вывучае комплексная навуковая дысцыпліна Скарыназнаўства. Іменем Скарыны названы вуліцы ў Мінску, Полацку, Віцебску, Нясвіжы, Оршы, Слуцку, Маладзечне і іншых гарадах, а таксама Гомельскі ўніверсітэт.

Помнікі Скарыне пастаўлены ў Полацку, Мінску, Лідзе, Вільнюсе. Уведзены дзяржаўныя ўзнагароды Беларусі – медаль Скарыны і ордэн Скарыны.

Да юбілею беларускага друку Алесь Дудар сказаў наступныя словы:

О, Францішак... Францішак Скарына,
Што над гранкай дукарскаю гнуўся!..
Ведай, праца твая пакарыла
Новы свет для сівой Беларусі!
Мы успомнім Францішка Скарыну,
Што радзіўся калісь над Дзвіною,
Вандраваў над яе берагамі,
Што аправіў мужычую мову
У неўміраючы гнуткі пергамент.

Ён даў нам самую магутную зброю – кнігу. І таму подзвіг Францішка Скарыны ніколі не будзе забыты.